ДЗВІНСКІ ЎЗГОРАК

*Кроч на свой родны,
дзвінскі ўзгорак,
каб глядзець
у будучую сінь*

**ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №2 (127)
СТУДЗЕНЬ 2021 ГОДА**

ІНІЦЫЯТЫВА

«КРУГЛЫ СТОЛ» ДЛЯ САМАКІРАВАННЯ

Віцебскія праваабаронцы пабывалі на асабістым прыёме ў старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў.

11 студзеня праваабаронцы Павел Левінаў і Леанід Свецік пабывалі на асабістым прыёме грамадзян, які праводзіў старшыня Віцебскага абласнога Савету дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў.

У выніку абмену думкамі была дасягнутая прынцыповая згода на ўдзел дэпутатаў абласнога ўзроўню ў «круглым стале», які плануецца правесці ў Віцебску для абмеркавання Закону аб мясцовым кіраванні і самакіраванні.

«Ініцыятыва, якая была прапанаваная на пачатку студзеня 2021 году намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў дэпутатам Аляксеем Ягоравым, атрымала падтрымку з боку праваабаронцаў. На наш погляд, гэта стане добрай нагодай для канструктыўнай дыскусіі паміж дэпутатамі розных узроўняў, прадстаўнікамі мясцовых партый і грамадскіх арганізацый аб шляхах развіцця мясцовага кіравання і ўдзеле грамадзян у кіраванні дзяржаўнымі справамі», – патлумачыў мэты ўдзелу праваабаронцаў у маючым адбыцца «круглым стале» праваабаронца Павел Левінаў.

Уладзімір Цярэнцьеў, як кіраўнік абласной прадстаўнічай улады, коратка распавёў праваабаронцам пра кансалідаванае бачанне магчымых зменаў структуры кіравання сельскімі тэрыторыямі, пра ўмацаванне інстытуцыі вясковых старостаў і ліквідацыю сельсаветаў як неэфектыўных.

На думку праваабаронцаў, у выпадку рэалізацыі такога сцэнару ў сельскай мясцовасці адбудзецца парушэнне балансу ўладаў: выканаўчая ўлада акажацца манапалістам на вёсцы, што, безумоўна, прывядзе да карупцыі і пагаршэння кіраўніцкіх паслуг, кіраўніцкаму валюнтарызму, прывядзе да канфліктаў з мясцовым насельніцтвам, а галоўнае – выканаўчая ўлада выйдзе з-пад кантролю з боку Саветаў дэпутатаў.

Бакі прызналі, што рэфармаванне мясцовых органаў ёсць важным і актуальным пытаннем для грамадзян, якое немагчыма падрабязна абмеркаваць у фармаце «прыёму грамадзян». Таму было вырашана працягнуць дыскусію падчас абмеркавання новай рэдакцыі Закону аб мясцовым кіраванні і самакіраванні на «круглым стале», які мае адбыцца ў лютым.

**Лявон Яфрэменка
"Віцебская вясна"**

COVID-19

ПОВЕРИМ ОБЛЗДРАВУ?

Облздрав рассказал о ситуации с коронавирусом на Витебщине после январских праздников. В Витебской области, уверяют официальные лица, снижается заболеваемость острыми респираторными инфекциями, включая коронавирусную.

За прошедшую неделю по сравнению с предыдущей количество случаев ОРИ стало меньше на 15%, сообщают «Витьбичи» со ссылкой на облздрав.

Сезонная заболеваемость, по словам чиновников, характеризуется средней интенсивностью и находится ниже эпидемического уровня. Среди заболевших 65% — это взрослые люди.

Уменьшение количества пациентов с пневмониями позволяет перепрофилировать больничные койки для оказания медпомощи в обычном режиме. На этой неделе к привычной работе вернулись отделения областного клинического центра дерматовенерологии и косметологии. По 40 коек перепрофилировали в Оршанской городской больнице № 1 и Лепельской районной больнице.

После Нового года облздрав сообщил, что количество пациентов с COVID-19 стабильно снижается по всей Витебской области.

— После праздников будем видеть: если подъем заболеваемости будет незначительным, то начнем выводить лечебные учреждения, чтобы они работали в обычном режиме, — отметил начальник главного управления по здравоохранению облисполкома Михаил Вишневецкий.

В первую очередь планируют перепрофилировать бывшую «железнодорожную» больницу и отделение кожно-венерологического диспансера на улице Суражской. БСМП, областная и инфекционная больницы по-прежнему будут принимать больных с коронавирусом.

Всего с начала пандемии в Беларус и зарегистрированы 217 696 человек с положительным тестом на COVID-19. Выздоровели 200 132 пациента, у которых подтвержден этот диагноз.

За весь период распространения инфекции на территории страны умерли 1544 пациента с выявленной коронавирусной инфекцией — 9 человек за последние сутки.

Глава белорусского Минздрава Дмитрий Пиневич сообщил, что заболеваемость коронавирусом в Беларуси продолжает снижаться. Больницы страны постепенно возвращаются к обычному режиму работы.

По прогнозам до середины — конца февраля будет падение уровня заболеваемости коронавирусной инфекцией. Затем, возможно, — небольшой рост, связанный с приходом обычных эпидемических заболеваний, в частности гриппа. Однако высокая интенсивность уровня COVID-19 продлится до конца весны.

TUT.BY

ПЕРАСЛЕД

КРОКАМ РУШ ПА-СКАНДЫНАЎСКУ!

19 студзеня суд Першамайскага раёну Віцебску вынес рашэнне ў справах Тацціны Севярынец і Алены Касновай, затрыманых разам з іншымі жанчынамі 13 студзеня ў лесе за станцыяй «Лучоса» і абвінавачаных паводле артыкулу 23.34 КаАП.

Паводле міліцэйскага рапарту і пратаколаў, ранкам 13 студзеня ў Першамайскі РАУС патэлефанаваў ананім, які паведаміў, што ў лесе каля станцыі «Лучоса» грамадзянкі развешваюць бел-чырвона-белыя стужкі, размахваюць БЧБ-сцягам, перадаюць яго з рук у рукі, фатаграфуюцца. У лес выехала група міліцыянтаў. Паводле міліцыі, у «несанкцыянаваным пікетаванні» (менавіта так гэта трактавалі супрацоўнікі МУС) ўзялі ўдзел Тацціна Севярынец, Алена Каснова, Раіса Кухто, Людміла Камінская, Людміла Валадкевічі, Тамара Ільіна. Сцяг у руках трымала нібыта Тацціна Севярынец.

У 10.30 жанчын затрымалі і даставілі ў Першамайскі РАУС. У заплечніку Тацціны Севярынец знаходзіліся два бел-чырвона-белыя сцягі. Яшчэ адзін сцяг міліцыянты нібыта знайшлі на месцы затрымання. Па словах жанчын, знайшлі метраў за 30 ад месца затрымання. Па сведчаннях міліцыі, — за тры метры ад групы.

Тацціна Севярынец і Алена Каснова з пратаколам не пагадзіліся, выстаўленыя супраць іх абвінавачванні адрынулі. Патлумачылі, што прыйшлі ў Шпілеўскі лес, каб заняцца фізкультурай. Севярынец мелася даць жанчынам майстар-клас па скандынаўскай хадзе. Сустрэліся на станцыі Лучоса, прайшлі ў лес, але паспелі зрабіць толькі некальки рухаў, як з'явіліся асобы ў цывільным, якія заявілі, што яны супрацоўнікі міліцыі, і запатрабавалі праехаць у пастарунак...

Тацціна Севярынец патлумачыла, што два сцягі, знойдзеныя міліцыяй у заплечніку, яна пасля занятку ў лесе меркавала перадаць аднаму знаёмаму. Актывістка не хацела, каб у выпадку магчымага міліцэйскага вобшуку ў яе кватэры сцягі былі канфіскаваныя.

Падчас анлайн-апытання маёра Вадзіма Склімянка высветлілася, што ад 12-га да 15-га студзеня аўтаматычная сістэма запісу гукавых паведамленняў у Першамайскім РАУС знаходзілася ў непрацоўным стане. Гэтая акалічнасць не дазволіла выклікаць у суд аўтара ананімнага тэлефанавання, але яна не перашкодзіла Склімянку ўнесці ў пратакол не пацверджаныя ніякімі доказамі факты. Міліцыянт тлумачыў, што на момант складання пратаколу ён не ведаў пра сапсаваную сістэму запісу тэлефанаванняў, таму меў давер да словаў ананіма.

Таксама ў якасці сведкаў былі апытаныя супрацоўнікі Першамайскага РАУС Аляксей Пагарэльскі, які ўдзельнічаў у затрыманні, і Уладзімір Казлоўскі, які складаў пратакол на Алену Каснову. Як сведкаў апыталі і ўдзельніц спартовага шпацыру Людмілу Камінскую і Людмілу Валадкевіч.

Суддзя Вераніка Барысава пастанавіла ў выніку спыніць справу ў сувязі з недаказанасцю вінаватасці Севярынец (паводле ч.3 арт. 23.34 КаАП) і Касновай (ч.1 арт. 23. 34 КаАП). Суддзя прынесла афіцыйнае прабачэнне ў сувязі са спыненнем справы.

Нагадаем, што з міліцэйскага пастарунку 4 жанчыны былі кінутыя ў ізалятар часовага ўтрымання, дзе правялі ноч, а Тамара Ільіна трапіла ў лякарню. Разгляд справаў Раісы Кухто, Людмілы Камінскай і Людмілы Валадкевічі адбудзецца 20 студзеня ў судзе Кастрычніцкага раёну.

**С. Горкі
«Віцебская вясна»**

ПАКАРАЛІ БЫЛУЮ МЕДСЯСТРУ

20 студзеня суд Кастрычніцкага раёна Віцебска пачаў разглядаць крымінальную справу Юліі Кашаверавай. 22-гадовую дзяўчыну вінавацяць у тым, што на вулічным маршы яна пашкодзіла міліцэйскую машыну.

Здарылася ўсё 4 кастрычніка.

«Паводле даных следства, Юлія ішла ў пешай калоне па горадзе разам з іншымі ўдзельнікамі «несанкцыянаванага мерапрыемства», якія выступалі супраць вынікаў прэзідэнцкіх выбараў, — паведамляў партал tut.by у рэпартажы з суда. —

Каля дома № 74 на Маскоўскім праспекце да пратэстоўцаў пад'ехала міліцыя. Аднаго з мужчын затрымлівалі. Удзельнікаў шэсця гэта абурыла, яны спрабавалі адбіць аднадумца. У адказ сілавікі ўжылі газ з балончыка.

(працяг на стар. 2)

ПЕРАСЛЕД

(пачатак на стар. 1)

Падчас сутычкі з міліцыяй Кашаверава, як сцвярджае следства, пашкодзіла мікрааўтобус Ford Transit, які належыць УУС аблвыканкама: «Ударыла па ім нагой не менш за тры разы, нанёсшы ўвагнутасць, а таксама кінула ўслед аўтамабілю драўляную палку».

У той жа дзень Юлію затрымалі, 7 кастрычніка быў суд па 23.34 — але пратакол адправілі на дапрацоўку. Дзяўчыну выпусцілі.

Але, як высветлілася, ненадоўга.

«20 кастрычніка да нас прыйшлі, — расказаў «Нашай Ніве» Сяргей Іванавіч, бацька дзяўчыны. — Дома быў ператрус, Юлю забралі сілавікі. 22 кастрычніка — другі раз ператрус. Забралі камп'ютар, тэлефоны, флэшкі, Юліну вопратку. І з 20 кастрычніка Юля знаходзіцца ў віцебскім СІЗА №2».

Цяпер Юлію Кашавераву абвінавачваюць у злосным хуліганстве: гэта ад 1 да 6 гадоў зняволення.

На судзе дзяржабвінаваўца паведаміў, што міліцыі нанесеная шкода на суму 841 рубель. Раней, дарэчы, сілавікі паведамлялі аб 405 рублях шкоды, частка яе абвінавачаная ўжо кампенсавала.

Акрамя таго, паводле даных следства, Юлія сарвала медыцынскую маску і форменную шапку з камандзіра звяна АМАПа Аляксея Альхімовіча.

Пакуль што ў пасяджэнні перапынак аж да 4 лютага. Юлія паказанняў яшчэ не давала.

«Летась яна толькі скончыла віцебскі медыцынскі каледж. У канцы ліпеня ўладкавалася на працу медсястрой 103 мабільнай брыгады», — кажа бацька Юліі.

7 кастрычніка быў той суд па 23.34, яе адпусцілі, на наступны дзень яна выйшла на працу — там адразу прапанавалі звольніцца. Юля пагадзілася, 9 кастрычніка яе аператыўна звольнілі.

Цяпер на судзе я прысутнічаў. Юля змянілася, вядома: бледная, кашляе», — кажа тата.

«Напэўна, у любым выпадку дачку прызнаюць вінаватай», — прагназуе тата Юліі.

Лісты да Юліі даходзілі, ішлі 8-10 дзён. Яна просіць перадаць падзяку людзям, якія дасылалі ёй словы падтрымкі.

УШ
«Наша Ніва»

ПАРТЫЕЦ ПАД ВАРТАЙ

Сябру Партыі БНФ Уладзіміру Малахоўскаму змянілі меру стрымання — узялі пад варту.

Уладзіміра Малахоўскага ўзялі пад варту 13 студзеня ў будынку следчага камітэту, куды мужчына прыйшоў разам з адвакатам. Раней у якасці меры стрымання да яго была ўжытая падпіска аб нявыездзе. Цяпер Малахоўскі знаходзіцца ў СІЗА-2. Калі над ім адбудзецца суд — пакуль дакладна невядома. Праваабаронцы мяркуюць, што працэс можа распачацца ўжо праз некалькі тыдняў.

Міліцыянты затрымалі Уладзіміра Малахоўскага летась на вулічным шэсці 13 верасня падчас сутыкнення пратэстоўцаў і супрацоўнікаў міліцыі на скрыжаванні пр. Чарняхоўскага і Будаўнікоў.

Пры затрыманні яму пашкодзілі пальцы на руцэ. Спачатку Малахоўскага ўтрымлівалі ў СІЗА, але потым змянілі меру стрымання на падпіску аб нявыездзе. Мужчына мае інваліднасць 3-й групы і змагаецца з анкалогіяй.

На волі ў яго засталіся жонка і двое няпоўнагадовых дзяцей.

Уладзіміру Малахоўскаму інкрымінуюць злачынства, прадугледжанае арт. 364 КК («Гвалт або пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні супрацоўніка ўнутраных спраў»). Яму пагражае да шасці гадоў пазбаўлення волі.

Зміцер Міраш
«Віцебская вясна»

БУДАЎНІЦТВА

НОВОСЕЛЬЕ В ЯНОВИЧАХ

Семьи работников агрокомплекса «Яновичи» Витебской бройлерной птицефабрики справили новоселье.

В Яновичах Витебского района сдан в строй 24-квартирный жилой дом, в котором справили новоселье семьи работников агрокомплекса «Яновичи» Витебской бройлерной птицефабрики. В этом мероприятии принял участие председатель облисполкома Николай Шерстнёв.

В доме с централизованным водопроводом, канализацией и газоснабжением по шесть 1-комнатных, двенадцать 2-комнатных квартир, в которые заселились молодые специалисты, животноводы, в том числе две многодетные семьи. Треть квартир осталась в резерве, что, безусловно, поможет в решении проблемы с кадрами на селе.

Впрочем, в агрокомплексе дефицита в кадрах не наблюдается. Более того, сюда стремятся попасть из других регионов. В числе таких — многодетная семья Михайловых из Лиозненского района.

— Первопроходцем стал сын Роман, который устроился в агрокомплекс «Яновичи» механизатором. Он ездил ежедневно на работу за 30 километров. А за ним последовали я с мужем и младшими детьми — 12-летним Сергеем и 9-летним Артемом. И это несмотря на то, что имели собственное жилье. Для нас большая радость, что наконец-то все наши мытарства закончились, и мы получили собственную трехкомнатную квартиру в Яновичах, где и обоснуемся. Здесь есть школа, детский сад, напротив дома начато строительство фирменного супермаркета «Ганна». Что еще нужно? — поделилась лаборант Светлана.

— Старшая дочь с семьей трудится в хозяйстве «Полудетки» Витебского района.

Жилой дом — большая радость для всех работников агропромышленного комплекса, подчеркнула генеральный директор птицефабрики Анна Норкус. Получили ключи от квартиры те, кто вносит особый вклад в развитие АПК. Третья часть квартир в доме останется в резерве для перспективных кадров. Анна Васильевна отметила, что они решают в комплексе вопросы: создают благоприятные условия труда, выплачивают достойную зарплату и обеспечивают кадры жильем. Остается только трудиться на славу и процветание коллектива.

Председатель облисполкома Николай Шерстнёв, поздравляя новоселов со знаменательным в их жизни событием, подчеркнул, что Яновичи считаются периферией, если ехать из Витебска, а здесь кипит жизнь. За последнее время изменился облик села, возведены молочно-товарный и зерносушильный комплексы, проведена реконструкция машинотракторного парка. Витебская бройлерная птицефабрика с завидным постоянством открывает новые производственные и социальные объекты, что лишний раз подчеркивает: на периферии можно и нужно жить. Тем более, что у руководства птицефабрики огромные планы по созданию сельскохозяйственного производства XXI века, представляющего собой механизацию, компьютеризацию, мощную технику, высококлассное оборудование. Николай Николаевич привел цифру: на Витебщине за последние 10 лет на 45 тыс. человек уменьшилось количество трудоспособных на селе, это столько, сколько их имеется сейчас. Цифры заставляют думать, как привлечь на село молодежь. Жилье — один из стимулов, подчеркнул глава области.

ЕЛЕНА БАШУН
«Витебские вести»

ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ

ВЗОРВАНА БАШНЯ

Под Витебском взорвали водонапорную башню: потребовалось 6 кг взрывчатки.

В деревне Калиново Витебского района 22 января сотрудники пожарного аварийно-спасательного отряда «Витязь» взорвали заброшенную водонапорную башню, сообщает МЧС.

Кирпичная водонапорная башня принадлежала частному предприятию «Стройсфера». Она не использовалась и потенциально могла обрушиться.

Чтобы взорвать 20-метровую башню, спасателям понадобилось 6 кг взрывчатого вещества.

А.Адамов

КРАЯЗНАЎСТВА

УКАЗАН ИСТОК ВИТЬБЫ

Житель Витебска ультрамарафонец Евгений Гуцалов 20 января установил в лесу в Витебском районе памятную табличку у истока реки Витьба, в честь которой назван северный областной центр.

Мужчина считает, что теперь у любителей истории и природы родного края есть еще одно интересное место на карте, куда можно ходить в походы.

Витебск — город трех рек. Одна из них — Витьба — и дала ему название.

Витьба — небольшая река, ее длина 33 километра. Но если ее устье знает каждый горожанин и турист — оно расположено прямо в центре Витебска, у Успенской горки, — то где берет свое начало река, знает не каждый.

Исток находится возле деревни Поддубье Витебского района, в лесу. Любители природы родного края там, конечно же, бывали. Некоторым из них приходила мысль: вот бы это место обозначить каким-то памятным знаком. И вот нашелся человек, который это сделал!

20 января витеблянин Евгений Гуцалов вместе с другом Егором установили в районе Поддубья недалеко от истока реки табличку с надписью на родном языке: «З гэтых мясцін бярэ свой пачатак Віцьба. Рака, на якой стаіць старажытны горад Віцебск».

Табличка сделана из оцинкованной жести, ее дополняют три старинные фотографии города, на которых изображена Витьба.

— Табличка стоит не возле самого истока — там болото, а немного дальше, примерно в километре, — рассказывает TUT.BY Евгений. — Место мы выбрали очень красивое: поляна, вокруг хвойный лес вперемежку с ольхой. Летом туда, не скрою, будет сложновато добраться, так как по дороге вокруг заросли травы, бурелом, болото, но зимой, ранней весной и поздней осенью те, кто захочет увидеть, откуда начинается Витьба, дойдет без проблем.

— А как родилась идея установить табличку?

— Я люблю путешествовать. Сейчас, в эпидемию коронавируса, выехать за границу нельзя, поэтому изучаю Беларусь, езжу в различные красивые места. Было интересно узнать, откуда же начинается Витьба. Спросил в соцсетях: кто хочет поискать? Люди откликнулись. И мы компанией из четырех человек нашли это место. Решили установить рядом табличку. Но хотелось, чтобы она не была пластиковой. Помогли такие же энтузиасты. Например, сделала саму табличку Наталья из Петрикова Гомельской области. Выбрали хороший день для установки. Доехали в те места на машине, а потом еще шли 5 километров по лесу — с лопатой, с этой табличкой, по сугробам. Но я очень доволен! И спасибо всем, кто мне помог реализовать замысел.

Если захотите увидеть места, где берет начало Витьба, и памятную табличку, то вот вам координаты: 55.177278 с.ш., 30.492661 в.д.

— Витьба в своем начале, конечно, не такая, как в Витебске. У истока она похожа на ручей шириной примерно полметра. И этот ручей петляет, — рассказывает Евгений. — Сразу вспоминается легенда про Витьбу: как красивая девушка потерялась в лесу, бежала и плакала. Ее слезы не успевали высыхать. Так по земле побежал ручеек, а потом и река.

Евгений Гуцалов известен как ультрамарафонец: в июле 2019 года он за 10 дней пробежал 650 километров с севера на юг Беларуси. Через месяц вместе с американцем с белорусскими корнями Джаредом Голдман ом совершил 250-километровый забег по нашей стране. В феврале 2020-го Евгений сутки провел на беговой дорожке.

TUT.BY

АБ'ЯВА

Каб атрымліваць кожны нумар газеты "Дзвінскі Ўзгорак" паведаміце рэдакцыі аб гэтым. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то патэдэфануйце.

Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты "Дзвінскі Ўзгорак".

Наша газета стала размяшчацца на партале http://kamunikat.org, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

ПАРУ СЛОЎ ПРА ГАЛОЎНАЕ

Пачынаць новае жыццё прасцей за ўсё з 1 студзеня: прачнуўся, зрабіў зарадку, прыняў кантрасны душ і... перагарнуў старонку мінулага. І як пасля гэтага не абвясціць 2021-ы Годам народнага адзінства?



Яшчэ жывы класік неяк адзначыў, «што ідэя, кінутая ў масы, — гэта дзеўка, кінутая ў полк». Справядлівасць такога неардынарнага параўнання пацвярджае пошукавік газеты «СБ. Беларусь сегодня», якая апублікавала за першыя сем дзён 2021 года 15 артыкулаў з абгрунтаваннем актуальнасці і своечасовасці чарговай палітычнай інавацыі.

Сярод аўтараў — Вадзім Гігін, дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ. Яму я і даю слова: «Крызіс, які мы перажылі ў 2020 г., патрабуе сур'ёзнага асэнсавання, а нашаму грамадству неабходна нацыянальнае прымірэнне. Таму цяпер такая важная ідэя пра год народнага адзінства».

Свае надзеі Гігін ускладае на Усебеларускі народны сход. Сам факт яго склікання «ў адказны гістарычны момант» — надзвычай важны, бо «народнае адзінства, грамадскі мір і згода патрабуюць вялікай сумеснай працы» — як прыхільнікаў, так апанентаў адзінага палітыка (АП).

Вось такі ў БДУ дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук! Насуперак афіцыйнай ідэалогіі, ён уключае ў паняцце «народ» не толькі патрыётаў-дзяржаўнікаў, але і «пратэстуноў»! Калі б я ўжываў алкаголь, паспрачаўся б на скрыню каньяку, што ніводнага апанента АП сярод дэлегатаў маючага адбыцца «народнага веча» не будзе.

Мы будавалі, будавалі...

Новае жыццё варта пачынаць не толькі з кантраснага душа і зарадкі, але і з рэальнай ацэнкі дасягнутых вынікаў. Як, напрыклад, гэта зрабіў 6 студзеня таварыш Кім Чэн Ын у вітальнай прамове на з'ездзе Працоўнай партыі Карэі: «Задачы развіцця нашай гаспадаркі, што былі пастаўленыя ў цяперашнім пяцігадовым плане, мы не дасягнулі практычна ні на адным кірунку».

Далей яшчэ цікавей: «Мы павінны смела прызнаць свае недахопы і выпрацаваць новую палітыку. Барацьба за аднаўленне і развіццё нашай краіны і шчасце народа ўступае ў новы этап».

Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка, нагадаю, была ўтвораная ў верасні 1948 года — і вось ужо восьмы дзесятак гадоў яна ідзе сваім шляхам пад кіраўніцтвам бацькі, сына і ўнука з сямейства Кімаў. Важным вынікам паўночнакарэйскай самабытнасці стала прызнанне ўнука пра неабходнасць аднаўлення краіны. Мы будавалі, будавалі — і нарэшце пабудавалі тое, што мае патрэбу ў аднаўленні!

Галоўнаму архітэктару беларускай мадэлі да падобнага прызнання яшчэ далёка. Пра тое, што патрэбна новая палітыка, ён не выказваецца — ва ўсялякім разе, публічна. Зрэшты, за 26 апошніх гадоў наш адзіны палітык і ў схільнасці прызнаваць недахопы сваёй працы заўважаны не быў.

Адкрываю передвыбарчую праграму ўзору 2015 года. І тут амаль кожны абзац варты таго, каб быць працытаваным. Абмяжуюся адным, абраным выпадкова: «Усе пералічаныя меры ў сукупнасці забяспечаць нашай краіне новы эканамічны прарыў за кошт спалучэння эфектыўнага дзяржаўнага кіравання, прыватнай ініцыятывы і добрасумленнай працы нашых людзей».

А што па факце? Сярэднегадавы індэкс валавога ўнутранага прадукту за пяць гадоў склаў 100,7%! Гэта многа ці мала? Пытанне філасофскае. Нашы тэмпы эканамічнага росту саступалі сусветным амаль у пяць разоў. Гэта многа ці мала? Яшчэ адно філасофскае пытанне...

На новы эканамічны прарыў у 100,7% прэтэндаваць, бышцам бы, шанцаў няма. Але хто сказаў, што нашы тэмпы росту варта параўноўваць з сусветнымі? А давайце параўнаем нашы з нашымі — і ў якасці прыкладу для параўнання звернемся да «ліхіх 90-х».

За перыяд засілля нацыяналістаў ва ўладзе (1991–1995) сярэднегадавы індэкс ВУП склаў 91,9%. Адчуваеце розніцу? Пры нацыяналістах эканоміка падала. Пры АП яна расце. Вось толькі не зусім зразумела, пры чым тут АП. Але ці ёсць сэнс тлуміць сабе галаву з такой нязначнай нагоды?

Каханую не аддаюць

Яшчэ адно выказванне АП: «Я хачу, каб у краіне было ціха і спакойна. Напэўна, вы і самі гэтага хочаце. Калі вам не падабаецца цяперашні прэзідэнт, то толькі выбары могуць вырашыць гэтае пытанне. Толькі выбары. Я гэта кажу, як бы камусьці не падабалася».

Адкуль такія асцярогі наконт «падабаецца» / «не падабаецца»? Сярод маіх знаёмых, напрыклад, няма ні аднаго, каму б не падабаліся выбары. Але адначасова я не ведаю нікога, каму б пасля 1996 года пашчасціла прыняць удзел у «выбарах».

Праілюструю гэты парадокс на ўласным прыкладзе. За два тыдні да 9 жніўня я накіраваў у Лявада-цэнтр артыкул «Беларусь накануне шестого переутверждения Лукашенко». Уяўляеце ўзровень майго прадбачання!? За два тыдні! Яшчэ і папярэдняе галасаванне не пачалося, а я — навязлены нікому не вядомы Настрадамус, — у самы аўтарытэтны сацыялагічны часопіс «нашай Расіі» накіраваў артыкул пра перапрызначэнне нашага АП. І вы не паверыце — мой артыкул прынялі.

Выбары — гэта амаль заўсёды латарэя…Аднак, калі грэбаванне размеркаваннем галасоў заходзіць занадта далёка, то ўзнікаюць праблемы з тым, што ў паліталогіі прынята называць «легітымнасцю».

Пра дэфіцыт разумення

Легітымнасць — згода грамадства на падпарадкаванне існуючай эліце і ўладзе. Прынцыпы легітымнасці могуць мець вытокі ў старажытных традыцыях, рэвалюцыйнай харызме або ў дзеючым заканадаўстве.

Казаць пра старажытныя традыцыі сёння не даводзіцца. З рэвалюцыйнай харызмай не ўсё так адназначна. Аўтар мема «ліміт рэвалюцый у Беларусі вычарпаны» ў 1994 годзе прыйшоў да ўлады на рэвалюцыйнай хвалі. Харызмай — у адрозненне ад большасці сваіх супернікаў — ён, безумоўна, валодаў.

Але падтрымліваць легітымнасць выключна за кошт харызмы — задача архіскладаная, тым больш у грамадстве, у якім ад любові да нянавісці адзін крок. Адна справа, калі эканоміка дадае больш за 7% у год, і зусім іншае — калі нават штатным спецыялістам патрэбная цэйсаўская оптыка для фіксацыі поспехаў. У апошнім выпадку аказацца ў становішчы Акелы, які прамахнуўся, — толькі пытанне часу.

Легітымнасць — згода грамадства на падпарадкаванне існуючай эліце і ўладзе. Калі яна ёсць у наяўнасці — звяртацца па дапамогу да сілавікоў, каб ўтрымаць уладу, патрэбы не будзе. Пацверджанне гэтай азбукавай паліталагічнай ісціны пасля 9 жніўня беларусы маюць магчымасць назіраць практычна штодня.

З той жа оперы — шматлікія страшылкі. Апошняя (на момант напісання гэтага тэксту) была агучаная ў храме Узвышэння Святога Крыжа 7 студзеня: «Нам спакойнага жыцця не дадуць. Нам свабодна дыхаць ніхто не дазволіць, у цэнтры Еўропы. Гэта сутычка. І не дай Бог яна ператворыцца ў гарачую вайну на гэтай нашай тэрыторыі, але дзе не будуць вырашаца нашы пытанні, дзе не будзе нашых інтарэсаў. Вось гэтага дапусціць нельга. Гэта — галоўнае. І я вас прашу пра адно: каб з вашага боку было разуменне».

З апошнім сказам цяжка не пагадзіцца. Разуменне — гэта якраз тое, што сёння ў дэфіцыце. На яго пераадоленне і накіроўвае свае намаганні аўтар «Азбукі паліталогіі».

***

Пры ўсёй своеасаблівасці беларускай мадэлі, яна фарміруецца не без уплыву мэйнстрыму, што, у прыватнасці, выяўляецца ў тым, што расце попыт на легітымнасць, заснаваную на выкананні законаў, на працэдурах, прапісаных у Канстытуцыі.

Маладое пакаленне цяпер не захапіць ідэяй «дзяржавай для народа». Яны ядзе ўспрымаюць у якасці сучаснага варыянту пацёмкінскай вёскі. Маладое пакаленне 9 жніўня прад'явіла попыт на «дзяржаву народа», у якой народ з'яўляецца не аб'ектам маніпуляцый, а паўнавартасным суб'ектам палітыкі.

(скарочана)

Сяргей Нікалюк
"Новы Час"

СПОРТ

МЕНСК ПАЗБАВІЛІ ПРАВА ПРАВОДЗІЦЬ ХАКЕЙНЫ ЧЭМПІЯНАТ СЬВЕТУ

Беларусь пазбавілі права праводзіць сёлетні чэмпіянат сьвету па хакеі, які меўся праходзіць у Менску і Рызе. Такое рашэньне пацьвердзіла міжнародная хакейная фэдэрацыя (IIHF).

У паведамленьні арганізацыі гаворыцца, што рашэньне «непазьбежнае» і прымаецца зь меркаваньняў бясьпекі. Рада IIHF вызначыла, што цяпер у Беларусі немагчыма гарантаваць бясьпеку камандаў, гледачоў і афіцыйных асобаў, адзначаецца ў паведамленьні. Месца правядзеньня чэмпіянату замест Беларусі мае быць вызначана пазьней.

Чэмпіянат сьвету 2021 году плянавалася правесьці з 21 траўня па 6 чэрвеня ў Беларусі і Латвіі. Раней парлямэнт Латвіі адхіліў магчымасьць сумеснага правядзеньня ў 2021 годзе чэмпіянату сьвету разам зь Беларусьсю. Пра гэта гаварылася ў распаўсюджанай у панядзелак заяве камісіі сэйма па замежных справах.

«Латвія адхіляе любую магчымасьць зладзіць хакейны чэмпіянат разам зь Беларусьсю, бо пры цяперашніх абставінах, калі ў Беларусі праводзяцца гвалтоўныя рэпрэсіі, ладзіць спартовае мерапрыемства такога маштабу ў Менску недапушчальна», — прыводзіў партал delfi.lv заяву старшыні камісіі Рыхардса Колса.

Розныя эўрапейскія грамадзкія арганізацыі заклікалі IIHF перанесьці чэмпіянат сьвету 2021 году зь Менску з прычыны напружанай палітычнай сытуацыі ў Беларусі.

11 студзеня Аляксандар Лукашэнка заявіў, што Міжнародная фэдэрацыя хакею (IIHF) знаходзіцца пад ціскам у сувязі з сытуацыяй вакол правядзеньня чэмпіянату сьвету ў Беларусі.

"Радыё Свабода"

ЭКАНОМІКА

ЭКСПЕРТ АДКАЗВАЕ САЙТУ MYFIN. BY

У снежні рэзка падскочыла інфляцыя — такая інфармацыя з'явілася нядаўна. Ці варта беларусам і далей чакаць бурнага росту цэнаў? Як зменяцца іх даходы ў бліжэйшыя месяцы? Што будзе з беспрацоўем? На гэтыя і іншыя пытанні сайту Myfin.by адказала Кацярына Барнукова — акадэмічны дырэктар Беларускага эканамічнага даследча-адукацыйнага цэнтра (BEROC).

Цэны вырастуць, і значна

— Відавочна, што галоўным бачным для большасці беларусаў вынікам павышэння ПДВ стане рост цэнаў на лекі, многія з якіх і так каштавалі даражэй, чым у краінах-суседзях.

Хутчэй за ўсё, некаторы час на высокім узроўні будзе захавоўвацца рост коштаў.

Для гэтага ёсць аб'ектыўныя прычыны — рост коштаў у свеце ў цэлым плюс эфект пераносу ад леташняга росту курсу долара. І, вядома ж, дае пра сябе ведаць і дырэктыўнае крэдытаванне. Так што, хутчэй за ўсё, у студзені інфляцыя будзе значнай, але да двухзначных лічбаў (у гадавым выражэнні) справа наўрад ці дойдзе.

Не магу не адзначыць, што адмена льгот па ПДВ на лекі (падаражаюць усё, не толькі замежныя, бо айчынныя лекі таксама робяцца з імпартных кампанентаў) і дзіцячыя тавары

(працяг на стар. 4)

ЭКАНОМІКА

(пачатак на стар. №3)

ўдарыць у першую чаргу па самых неабароненых слаях насельніцтва. І больш за тое, ударыць значна, бо гэта тыя тавары, ад якіх складана адмовіцца і замяніць іх. Спосабаў зэканоміць на гэтым у насельніцтва няма.

Заробкі ўпадуць, і падрастуць не ва ўсіх

— У студзені заробкі заўсёды прасядаюць — на фоне снежаньскіх гадавых і квартальных прэмій, бонусаў і іншых выплат.

Так што падзенне не будзе нечаканым.

Але трэба разумець, што ў далейшым намінальны рост заробкаў будзе падтрымліваецца за кошт бюджэтнікаў — гэта павышэнне закладзена ў бюджэт-2021. Тое ж тычыцца пенсій і дапамог. Уласна, шмат у чым з-за гэтага ў нас і вялікі, 4-мільярдны дэфіцыт бюджэту, львіную долю з якога — 3 млрд рублёў — як раз і складаюць выдаткі на сацыяльныя патрэбы.

Прыватны бізнес застаўся без падтрымкі

— Відавочна, што дзяржава не працягнула руку дапамогі малому і сярэдняму бізнесу ніякім чынам. Прыватны сектар застаўся адзін на адзін перад тварам пандэмійнай пагрозы. І хоць некаторыя меры былі прапісаныя (у прыватнасці даплаты да мінімальнай зарплаты работнікам прадпрыемстваў, якія прастойваюць), і фармальна гэтыя грошы прадастаўляюцца ўсім, але пра выпадкі, калі імі змаглі скарыстацца прыватныя, і асабліва невялікія, кампаніі, я не ведаю.

Відавочна, што гэтая праблема ёсць, але, з іншага боку, — не абвастрылася праблема з беспрацоўем.

На фоне таго, што дзясяткі фірмаў у турыстычнай галіне, сферы паслуг, грамадскім харчаванні альбо рэзка скарацілі штат, альбо зусім закрыліся, дзясяткаў тысяч новых беспрацоўных не з'явілася.

Гэта відаць як з афіцыйнай статыстыкі, так і па выніках апытанняў, якія праводзіў BEROC.

Лепшыя і таленавітыя дапамогуць справіцца з беспрацоўем

— Так, вясной была цяжкая сітуацыя, але ў далейшым яна выраўнялася. Людзі разумелі, што ў бліжэйшыя месяцы працы не з'явіцца, таму сталі ўладкоўвацца, хто куды мог. Магу выказаць здагадку, што звольненыя з-за COVID-19 і памянялі сферу дзейнасці хутчэй за ўсё вымушаныя былі згаджацца на меншыя зарплаты.

Але многім з іх будзе дапамагаць тое, што наш рынак працы будзе мець патрэбу ў работніках з-за адтоку людзей з краіны.

Калі самыя лепшыя з'язджаюць, эканоміка пакутуе, але для астатніх вызваляюцца месцы і з'яўляюцца новыя магчымасці.

Ацаніць аб'ём адтоку беларусаў (абсалютная большасць якіх з'язджае не на заробкі, а назусім) пакуль складана. Выкажу здагадку, што ён невысокі з-за кавідных абмежаванняў, але як толькі яны будуць зняты (а сітуацыя ў краіне не зменіцца) можна будзе чакаць масавага ад'езду.

Беларусь могуць пакінуць і 150, і 200 тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў розных галін.

"Новы Час"

ЗАРОБКІ

БЕЛСТАТ ПРО ЗАРПЛАТЫ В БЕЛАРУСИ

Сколько белорусов зарабатывают больше 10 тысяч рублей в месяц, а сколько не видят и 300 рублей? Это всё знает Белстат.

Больше половины работников Беларуси получает зарплату меньше 1000 рублей в месяц — 54,3%. Об этом говорят данные Белстата о распределении численности работников по размерам начисленной заработной платы в ноябре 2020 года. В сравнении с маем прошлого года число тех, чей заработок недотягивает до 1000 рублей, снизилось на 4,2 процентных пункта — тогда их было 58,5%.

Белстат ежегодно публикует данные о распределении работников по размерам начисленной зарплаты за май и ноябрь. В статистике не учитывают микроорганизации и малые организации без ведомственной подчиненности.

По последним подсчетам, в ноябре прошлого года каждый четвертый белорус имеет зарплату от 1000,1 до 1500 рублей — 25,9%. У 16,9% работников — от 600,1 до 800 рублей в месяц. 15,8%, получает от 800,1 до 1000 рублей.

Если сравнить данные за ноябрь с теми, что были в мае прошлого года, можно заметить, что во всех диапазонах зарплат до 1000 рублей наблюдается сокращение получателей (в процентном выражении), а во всех диапазонах свыше 1000 рублей — рост. Несмотря на это, большая часть белорусов все еще не получает 1000.

Интересно, что средняя зарплата в Беларуси перевалила за эту цифру еще в декабре 2018-го — тогда она достигла 1 115,3 рубля. В январе и феврале 2019-го показатель слегка упал — до 981,6 и 977,6 рубля. В марте он снова перешагнул тысячный рубеж — средняя зарплата была 1 056,9 рубля. И с тех пор ниже 1000 она не опускалась. В ноябре 2020 года белорусы в среднем получили «грязными» по 1 300,5 рублей.

Как так получилось, что 54,3% работников имеют меньше тысячи, а средняя зарплата больше 1300 рублей? Здесь нужно учитывать особенности расчета номинально начисленных средних заработков. Здесь начисленный фонд зарплаты за месяц делится на количество работников. К примеру, в фирме работают 20 человек. 15 из них получают 400 рублей, а 5 — 4000. Но средняя заплата в компании будет 1300 рублей, несмотря на то, что большая часть сотрудников имеет заработок намного ниже среднего.

В ноябре прошлого года самыми высокооплачиваемыми были работники в горнодобывающей промышленности (средняя зарплата 2164 рубля), сотрудники, занимающиеся вспомогательной деятельностью в сфере финансовых услуг и страхования (2287 рублей), люди, связанные с деятельностью воздушного транспорта (2394). Еще больше в среднем зарабатывают работники в сфере информации и связи (4311) и в сфере информационных технологий (5602).

Самыми низкими заработки оказались у специалистов, оказывающих услуги в парикмахерских и салонах красоты (589 рублей), у работников сферы творчества и развлечений (702), у сотрудников библиотек, архивов, музеев и прочих в области культуры (718). Низкие средние зарплаты также у людей, чья работа связана с уходом в специализированных учреждениях и предоставлением социальных услуг (757), а также у работников, связанных с водным транспортом (766).

finance.tut.by/news715347.html

РУССКАЯ РУЛЕТКА

ВРАЧИ СОМНЕВАЮТСЯ В ВАКЦИНЕ «СПУТНИК V»

Что опаснее: коронавирус или вакцина от него? Вместе с медиками оцениваем риски. Разбираем научные данные об исследованиях «Спутника V». Решаем, прививаться или подождать. И делаем прогноз, все ли умрут, если мы бойкотируем вакцинацию.

16 января Минздрав Беларуси объявил о начале вакцинации медицинских работников, которые находятся в зоне риска заражения COVID-19. По официальным данным, в первую волну вакцинации планируется привить 20 тысяч человек. Ведомство составило план распределения вакцины по регионам — в зависимости от заявок медучреждений.

Использовать будут вакцину российского производства «Спутник V». Первая партия в 20 тысяч доз прошла контроль качества и с 16 января поступает в медучреждения страны, сообщил Минздрав.

Меньше всего вакцина нужна медикам Минска, больше всего — Гомеля

…Медработники Гомельской области больше других заинтересованы в вакцине как в количественном, так и в процентном соотношении. Посмотрим на решение Минздрава выделить для региона 4365 вакцин, что позволит, по подсчетам Naviny.by, иммунизировать 17,22% от общего числа среднего медперсонала и практикующих врачей Гомельской области.

При этом в Минске среди медиков спрос на «Спутник V» минимальный: привиться захотели 6,3%, или 2285 человек. Это самый низкий процент по стране.

С чем связана такая диспропорция между запросами Минска и Гомельской области? Этим Naviny.by поинтересовались в пресс-службе Минздрава. Однако ответа не получили — никакого вообще. Так что выскажем версию — страх перед неизвестным препаратом…

«За» быструю вакцинацию: эффективность «Спутника V» высокая

Вакцину от коронавируса «Спутник V» разработал российский НИЦЭМ имени Гамалеи.

«СпутникV» по сути это — аденовирусные частицы 26 серотипа (вирус простуды человека) с подсаженной на нее цепочкой РНК коронавируса. Организм человека, в который ввели такую вакцину, должен выработать антитела к коронавирусу — так появляется иммунитет. Эффективность оценивается в проценте людей, из числа получивших прививку, у которых антитела вырабатываются в достаточном количестве.

Арсений Палагин, руководитель пресс-службы РФПИ — Российского фонда прямых инвестиций, который осуществляет реализацию проекта «Спутник V», для Naviny.by рассказал: «Эффективность вакцины на данный момент оценивается в 91,4%. Это на 0,6% ниже заявленной до начала массовой вакцинации препаратом. Эти проценты — результат третьей, финальной точки клинических исследований, которые проходят в Москве. В клинических исследованиях принимает участие 31 тысяча человек, из них часть получила вакцину, другая — плацебо. С течением времени мы смотрим заболеваемость коронавирусом в обеих группах. И заболеваемость в группе, которая получила вакцину, в 20 раз ниже, чем в группе с плацебо, что эквивалентно эффективности около 90%».

В России вне клинических исследований идет программа массовой вакцинации, которая началась 5 декабря, на 42 дня раньше, чем в Беларуси.

«Против» поспешной вакцинации: безопасность не гарантирована

Коронавирус так себя разрекламировал, что страха более чем достаточно. И сегодня вопрос не в том, надо или не надо вакцинироваться в принципе, а в том — чем и когда? Вопрос в безопасности.

Однозначный сторонник прививок Александр Дечко — врач, директор медицинского центра «Добрый доктор» — прививаться от коронавируса не будет как минимум до сентября этого года.

«Я очень хочу привиться от коронавируса, но в истории уже были случаи, когда вакцинация, например, от RS-инфекции, приводила к летальным исходам. До сентября 2021 года прививаться от коронавируса я не буду, потому что раньше этого срока мы не сможем оценить реальную безопасность любой вакцины от коронавируса, не только „Спутника", но и других», — пояснил врач свою позицию.

Иммунизация от коронавируса напоминает врачу не плановую вакцинацию, а «терапию отчаяния» — есть в медицине есть такое понятие: «Принцип врачебный — „не навреди". Вот за что я переживаю и чего я боюсь — чтоб мы не навредили этой вакциной».

По словам Александра Дечко, ситуация пандемии, в которой мы находимся, вынуждает разработчиков и «Спутника», и других вакцин сокращать этапы клинических испытаний для скорейшего вывода вакцины в массы. На сегодня «Спутник V» не прошел полноценно все этапы клинических испытаний, как это положено.

Совет: как принять решение. По рекомендации нашего собеседника, каждый человек должен для себя взвесить «за» и «против». Если человек относится к группам риска, ему стоит задуматься о том, насколько он готов прививаться, отдавая себе отчет, что эта вакцина не настолько хорошо апробирована, чтобы гарантировать отсутствие последствий.

«Риск проведения прививки не должен превышать риска заболевания коронавирусом. Лично я продолжаю соблюдать социальную дистанцию, респираторный этикет, использование всех возможных средств индивидуальной защиты. И очень внимательно слежу за полномасштабными клиническими испытаниями всех вакцин», — поделился врач.

Александр Дечко обращает внимание, что фармакология — это бешеные деньги: «Не забывайте, что кроме интереса гуманистического — спасти мир от коронавирусной инфекции, у производителей вакцин есть интерес чисто коммерческий. Кто сделает действительно безопасную вакцину, будет одним из самых богатых людей, наравне с теми, которые изобрели пенициллин».

Науку настораживают белые пятна в исследованиях «Спутник V»

Не доверяет вакцине также научный сотрудник лаборатории проблем здоровья детей и подростков, врач-неонатолог Ирина Винокурова.

«Моим личным мнением, как врача, является то, что вопрос о научных данных, касаемых исследования вакцины „Спутник V", недостаточно освещен. Я нигде не увидела научную верификацию, доказательность того, что это работает или, наоборот, того, что это не работает. Если у меня есть научные сомнения насчет того, как это работает, то я буду категорически против, я не буду никому советовать те или иные способы оказания медицинской помощи, в том числе вакцинацию», — пояснят Ирина Винокурова в беседе с Naviny.by.

(сильно сокращено)

Татьяна Бубликова
Naviny.by

Заснавальнік і рэдактар: Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч

Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, вул. 1-я Сенненская д.5, Тэл. +375-29-218-98-38, e-mail: kas_vit@tut.by
Газета выдаецца з лютага 2014 г.

Падпісана да друку 27.01.2021 у 18.20
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца пры падтрымцы аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.